# ИСТОРИЧЕСКИЕ НАУКИ

УДК [930.1+37.09](476)



**В.А. ПІЛЕЦКІ**, доктар гіст. навук,
галоўны навуковы супрацоўнік
Цэнтра гісторыі навукі і архіўнай справы
ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі»,
г. Мінск, Рэспубліка Беларусь

*Статья поступила 10.03.2026 г.*

## ПРА МІЖПАКАЛЕННЫ ГРАМАДСКА-ЗНАЧНЫ ДОСВЕД І ЯГО ГІСТАРЫЧНУЮ ТРАНСЛЯЦЫЮ[1]

*Даследуецца роля міжпакаленнага грамадска-значнага досведу і яго гістарычнай трансляцыі як найважнейшага цэнтральнага фундаментальнага (сутнаснага) працэсу. Гаранта ўзнікнення, станаўлення (захавання) і прагрэсіўнага развіцця любой сацыяльнай агульнасці ў гісторыі. Падкрэслена, што грамадска-значны досвед не з'яўляецца статычным (дадзеным: раз і назаўжды), а знаходзіцца ў пастаянным дыялектычным (прагрэсіўна-рухомым) стане. У ходзе якога адбываецца паступовае вынаходніцтва, удасканаленне, назапашванне і бесперапынная міжпакаленная гістарычная трансляцыя форм жыццядзейнасці. Паказана, як пачыналася гістарычнае ўдасканаленне спосабаў перадачы грамадска-значнага досведу новым пакаленням людзей. Дадзена пераканаўчае тлумачэнне паняційнага зместу тэрмінаў "досвед і "навука", якія маюць падабенства і адрозненне, але знаходзяцца ў адным рэчышчы жыццёва практычнага досведнага кірунку. Больш за тое, хоць навука і заснавана на назапашванні сацыяльнага досведу мінулага, але з'яўляецца асобнай з'явай грамадскага існавання, якая ўяўляе надзвычай высокі ўзровень (спосаб, сферу) спазнання, адлюстравання, даследавання і прагназавання рэчаіснасці.*

***Ключавыя словы***: *гістарычная трансляцыя досведу, навука, міжпакаленны досвед, грамадска-значны досвед, формы грамадскай жыццядзейнасці.*

**PILETSKY V.A.,** Doctor of Hist. Sc.,
Chief Researcher at the Center for the History of Science and Archival Affairs
Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus

## ON INTERGENERATIONAL PUBLICLY SIGNIFICANT EXPERIENCE AND ITS HISTORICAL TRANSMISSION

*The role of intergenerational socially significant experience and its historical translation as the most important central fundamental (essential) process is investigated. The guarantor of the emergence,*

[1]Публикуется в авторской редакции

*formation (preservation) and progressive development of any social community in history. It is emphasized that socially significant experience is not static (given: once and for all), but is in a constant dialectical (progressively mobile) state. During which there is a gradual invention, improvement, accumulation and continuous intergenerational historical translation of forms of life. It is shown how the historical improvement of the methods of transferring socially significant experience to new generations of people began. A convincing explanation of the conceptual content of the terms "experience" and "science" is given, which have similarities and differences, but are in the same direction of vital practical experience. Moreover, although science is based on the accumulation of social experience of the past, it is a separate phenomenon of social existence. It represents an extremely high level (method, sphere) of cognition, reflection, research and prediction of reality..*

***Keywords**: historical transmission of experience, science, intergenerational experience, socially significant experience, forms of social life.*

**Уводзіны.** Тэрмін "досвед" – гэта адно з паняццяў тэорыі пазнання. Яно акрэслівае наяўнасць пэўнай колькасці ведаў, набытых ў працэсе жыцця, працы, камунікацыі з іншымі людзьмі, прафесійнай (альбо культурна-забаўляльнай) дзейнасці, удзелу ў гістарычных падзеях, ды інш. Гістарычная трансляцыя досведу гэта перадача дарослымі грамадзянамі і засваенне (набыццё) досведу дзецьмі, якое забяспечвае іх сацыялізацыю [1, с.139–143]. Што, у сваю чаргу, азначае працэс набыцця сацыяльнай сутнасці маладога чалавека. Які адбываецца (пад уплывам грамадскага асяроддзя) шляхам засваення ім сацыяльнага досведу – каштоўнасцяў, назапашаных чалавецтвам.

Набыццё досведу (як працэс) – гэта ўсведамленне (інакш: разумовае засваенне) структуры і сутнасці пэўных падзей, працэсаў і з'яў, форм камунікацыі. І ператварэнне яго (гэтага ўсведамлення) у пэўныя ўстойлівыя разумовыя і функцыянальна-дзейсныя стэрэатыпы (шаблоны) практычных дзеянняў, ведаў і навыкаў паводзін у магчымых аналагічных (ці падобных) сітуацыях, працэсах, з'явах альбо падзеях. Якія дазваляюць сацыяльнаму індывіду дастойна (нароўні з іншымі) удзельнічаць у змаганні за выжыванне як у прамым так і пераносным сэнсе.

Дасведчаны чалавек гэта той хто валодае досведам у той ці іншай галіне. Той хто знаёмы з працэсам (з'явай, падзеяй) што трапіўся яму на жыццёвым шляху. І ведае як патрэбна сябе паводзіць у названай жыццёвай сітуацыі, а таксама валодае пэўнай сумай практычных (функцыянальных ведаў) для вырашэння той ці іншай задачы якую паставіла перад ім жыццё.

Міжпакаленны досвед гэта вызначэнне (дэфініцыя) якое пазначае тую сукупнасць ведаў і навыкаў (розную для кожнага гістарычнага перыяду, той ці іншай сацыяльнай супольнасці), якая перадаецца ў якасці разумовай альбо практычна-функцыянальнай каштоўнасці ад былых пакаленняў будучым. Ад дарослых грамадзян сваім маладым нашчадкам. А гістарычная трансляцыя досведу, як адзначана вышэй, гэта сам працэс спецыфікі перадачы досведу ад былых пакаленняў будучым.

Мэта даследавання. Матэрыял артыкула прысвечаны высвятленню ролі міжпакаленнага грамадска-значнага досведу ў гістарычнай эвалюцыі чалавецтва. Як асобнай (самастойнай) каштоўнасці што адыграла цэнтральную ключавую ролю ў гéнезісе (зараджэнні і станаўленні ў якасці асобнай сацыяльна-гістарычнай з'явы) чалавечага грамадства. А таксама ролі ў яго паспяховым змаганні за выжыванне сярод глабальных сіл Прыроды (кліматычных умоў, жывёльнага і расліннага свету).

Гаворачы пра гістарыяграфію праблемы неабходна зазначыць што непасрэдна міжпакаленны грамадска-значны досвед і яго гістарычная трансляцыя не з'яўляліся прадметам асобнага гістарыяграфічнага даследавання. Тым не менш сегменты тэмы, паасобку (без аб'яднання ў адзіную навуковую праблему), знайшлі адлюстраванне на старонках шматлікіх даследаванняў у айчыннай і замежнай літаратуры. Так напрыклад, звесткі пра

досвед як асобную катэгорыю тэорыі пазнання маюцца ў філасофскай літаратуры [2]. Што тычыць гістарычнай трансляцыі досведу (праблемы блізкай да навучання і выхавання) то яна шырока асвятляецца як у айчынных, так і ў замежных [3] гісторыка-педагагічных даследаваннях. Тут маецца літаратура прысвечаная перадачы досведу ў старажытным грамадстве [4, с.91–101], а таксама ў антычнасці [5], Сярэднявеччы [6], ды іншых гістарычных перыядах. Геаграфічны ахоп тэрыторый дзеяння названай праблематыкі, ахоплівае як ўсходнееўрапейскі рэгіён [7], так і дзяржавы Заходняй Еўропы [8]. Ёсць працы што закранаюць суадносіны навукі і адукацыі [9]. Тым не менш пастаноўка праблемы ў фундаментальным накірунку (падобна сфармуляванай у дадзеным артыкуле), для высвятлення “ролі міжпакаленнага грамадска-значнага досведу ў гістарычнай эвалюцыі чалавецтва” яшчэ не ажыццяўлялася.

**Асноўная частка.** У аснове жыцця і дзейнасці любога грамадства ў гісторыі ляжыць грамадска-значны досвед. Прычым ён не з’яўляецца статычным (дадзеным: раз і назаўсёды), а знаходзіцца ў пастаянным дыялектычным (прагрэсіўна-рухомым) стане. Падчас якога адбываецца паступовае вынаходніцтва, удасканаленне, накапленне і непарыўная міжпакаленная гістарычная трансляцыя форм жыццядзейнасці. Перадача новым (падрастаючым) пакаленням людзей. Якія ў сваю чаргу, дапаўняюць і ўдасканальваюць на працягу ўласнага жыцця атрыманы ад папярэднікаў досвед. А потым, арганізоўваюць яго перадачу сваім нашчадкам.

Вынаходніцтва, замацаванне ў грамадскай свядомасці і перадача новым пакаленням найбольш аптымальных спосабаў арганізацыі розных накірункаў жыццядзейнасці гэта цэнтральны асноватворны (істотны) працэс. Гарант зараджэння, станаўлення (выжывання) і прагрэсіўнай эвалюцыі любой грамадскай супольнасці.

Кожнае новае пакаленне, падчас свайго перыяду жыццядзейнасці, павялічвае колькасць важных для сацыяльнага прагрэсу ведаў і навыкаў. Пашырае і ўдасканальвае агульнаграмадскі багаж сацыяльна-значнага досведу ў розных сферах. І тым самым спрыяе захаванню чалавечага соцыуму як правамоцнага ўдзельніка гістарычнай эвалюцыі глабальнага прыроднага асяроддзя.

Альбо, згодна з біблейскай касмагоніяй (прызнанай у хрысціянстве, юдаізме, і ісламе), часткай створанага Госпадам Сусвету. Дзе сказана: “*...спачатку стварыў Бог неба і зямлю… і аддзяліў … святло ад цемры... і назваў … сушу зямлёю, а сход вод назваў морамі... ...і стварыў … два свяцілы вялікія: свяціла большае, для кіравання днём, і свяціла меншае, для кіравання ноччу, і зоркі... ...і сказаў Бог: хай створыць зямля душу жывую па родзе яе, быдла, і гадаў, і звяроў зямных па родзе іх... ...і сказаў Бог: створым чалавека па вобразу Нашаму [і] паводле падабенства Нашага, і няхай валадараць яны над рыбамі марскімі, і над птушкамі нябеснымі, [і над звярамі, і над быдлам, і над усёю зямлёю, і над усімі гадамі, што поўзаюць па зямлі…*” [10].

Так ці інакш было спачатку (мы не будем спыняцца на гэтым пытанні), але менавіта ўдалая праца з грамадска-значным досведам дазволіла чалавецтву захавацца ў гісторыі ў якасці асобнага віду. Захаваць сваю ролю “паспяховага гульца” (*рус*.: “игрока”), сярод глабальных сіл Прыроды альбо ў створаным Госпадам Сусвеце. Дазволіла выжыць, і не проста забяспечыць сваё існаванне, але дабіцца прагрэсіўнай эвалюцыі. Зрабіць так каб жыццё на працягу стагоддзяў станавілася больш дасканалым, упэўненым і прыдатным для пасяховага змагання за выжыванне.

Усё сказанае вышэй, датычыцца як сучасных, высока інтэлектуальных тэхналагічных соцыумаў, так і прымітыўных першабытных чалавечых супольнасцяў. Звесткі аб якіх захаваліся ў глыбіні стагоддзяў і тысячагоддзяў, але даступныя сучасным даследчыкам дзякуючы шматлікім артэфактам і гістарычным крыніцам. Здабытым археолагамі, даследчыкамі ў галіне палеантрапалогіі, этнаграфіі і многіх іншых навук.

Гісторыя чалавецтва, па-сведчанні сучаснай навукі, пачалася з таго, што прадстаўнік “вышэйшых прыматаў” узяў у рукі палку ці камень і выкарыстаў яго для здабычы харчавання. Для палявання на звера і здабычы высокакаларыйнага прадукту –

мяса. Альбо, для выкопвання прыдатных для выкарыстання ў якасці харчу салодкіх карэнняў, карняплодаў, клубняў, ці інш. Наступным этапам было ўдасканаленне гэтага пачатковага інструмента ў якасці прылады працы. Завастрэнне палкі, ці кавалка косткі. Альбо стварэнне каменнага (часцей крамянёвага) вострага ляза для выкарыстання яго ў якасці нажа, ды інш.

Накапленне досведу ішло непарыўна. Потым быў вынайдзены навык свідравання адтулін у камені ці костках. Ён стварыў магчымасць замацоўваць колючыя і рэжучыя прадметы на палку і стварацць тым самым яшчэ больш тэхналагічную прыладу працы. Яе цяпер можна было скарыстаць напрыклад у якасці кідальнай зброі (дзіды, ці дроціка). Тым самым была павялічана эфектыўнасць важнага жыццёвага працэсу палявання на дзікіх жывёл. Што ў сваю чаргу дазволіла здабываць большую колькасць мяса. А значыць колькасныя параметры папуляцыі чалавекападобных істот, носьбітаў грамадскага досведу жыццядзейнасці пачалі значна павялічвацца.

Той жа працэс вынаходніцтва і ўдасканалення грамадска-значнага досведу дзейнічаў пры стварэнні рыбалоўнага кручка, вуды і пляцення сетак для лоўлі рыбы, а таксама, асваення тэхнікі стварэння ляпнога посуду. Апошні быў патрэбен для захавання лішкаў прадуктаў харчавання. Пазней было вынаходніцтва ганчарнага круга. З ім працэс стварэння посуду значна паскорыўся і пачынаў выходзіць на масавы (рамесны) узровень.

Важнай знаходкай было прыстасаванне скур здабытых жывёл у якасці адзення для захавання тэмпературы цела чалавека ва ўмовах халоднага клімату. Пазней, з дапамогай навукі пляцення рыбалоўных сетак (і прадзення), было ажыццёўлена вынаходніцтва такога віду дзейнасці як ткацтва. З гэтага часу з’явілася магчымасць стварэння палатна з якога пачалі вырабляць сапраўднае адзенне. Яно надзейна засцерагала ад холаду, было спадручным у штодзённым выкарыстанні і безумоўна палягчала эфектыўнае засваенне чалавекам новых тэрыторый, асабліва з халоднымі (прыледніковымі) кліматычнымі ўмовамі.

Гэтаму ж спрыяла і вынаходніцтва, а потым і ўдасканаленне тэхнікі пабудовы жытлаў. Спачатку былі створаны “будяны” у прыродных лажбінах (ярах, ці каля абрывістых берагоў рэк [11, с.157]). Абстаўленыя косткамі мамантаў ці іншых буйных жывёл і пакрытыя скурамі. Аб чым сведчаць напрыклад знаходкі на старажытнейшых верхнепалеалітычных стаянках (Бердыж і Юравічы) на тэрыторыі Беларусі. Дзе ў якасці будаўнічага матэрыялу былі “*...выкарыстаны чарапы, буйныя плоскія і трубчастыя косці Маманта і іншых. жывёл...*” [12, с.87–88]. Потым былі жытлы зямлянкавага і паўзямлянкавага тыпу. У якіх вучоныя знаходзяць нават пэўныя прыкметы дамашняга начыння. Далей былі зрубныя паўзямлянкавыя жытлы, зрубныя наземныя, з дахам і ваканніцамі. Ды іншыя віды, з тэндэнцыяй паступовага ўдасканалення.

І гэтак далей і далей, метадам спроб і памылак, малюсенькімі крокамі чалавецтва ўдасканальвала свой практычны досвед у розных галінах. Пашырала яго ўкараненне ў жыццёвых сітуацыях, развівала геаграфію прымянення, абменьвалася ім павышаючы свой культурны ўзровень на кожным новым вітку гістарычнай эвалюцыі.

Паралельна з накапленнем грамадска-значнага досведу ішло ўдасканаленне спосабаў яго перадачы новым пакаленням людзей. Спачатку дзяцей (асабліва хлопчыкаў пасля палавога выспявання) з дапамогай жорсткіх катаванняў прывучалі да паняцця забароны (табу [13, с.125–162]) на бескантрольныя палавыя кантакты. Што было абумоўлена засцярогай ад кровазмяшэння. Элементарны досвед жыццядзейнасці, у той час яшчэ, набываўся інстынктыўна-рэфлекторным спосабам распаўсюджаным і ў жывёльным асяроддзі (шляхам пераймання).

Пазней пачалі зараджацца ўзроставыя выпрабаванні падлеткаў (ініцыяцыі [14]). Якія канчаткова занялі асноўнае месца сярод першабытных спосабаў сацыялізацыі моладзі [15]. Паступова іх пачалі дапаўняць т.зв. перадініцыяцыйным перыядам. Падчас яго падлеткам паведамлялі комплекс жыццёванеабходных ведаў і навыкаў з матэрыяльнай і духоўна-абрадавай сфер

жыцця грамадства. І толькі потым праводзілі ўласна ініцыяцыйныя іспыты.

“*Такое навучанне –* у рэліктавых народаў (аўстралійскіх абарыгенаў, што мелі лад жыцця падобны першабытнаму), памеркаванні вядомага этнолага і антраполага А.П. Элькіна – *звычайна доўжы[-лася] год і больш, хоць часам укладва[-лася] ў карацейшы тэрмін*” [16, с.167].

На ранніх этапах ініцыяцыі суправаджаліся жорсткімі выпрабаваннямі на мяжы катаванняў (парэзамі на целе, выбіваннем часткі зубоў, уздзеяннем галюцыянагеннымі сродкамі, ударамі дубінай па галаве, выскубаннем валасоў, саскрабаннем скуры, выпрабаваннем агнём [17, с.322], ды інш). Усё гэта павінна было сімвалізаваць уяўную “смерць” былога падлетка і “нараджэнне” новага дарослага чалавека [18, с.46–49].

З цягам часу (пад уплывам накаплення жыццёвых кампетэнцый) колькасць ранейшых жорсткіх абрадаў сярод ініцыяцыйных выпрабаванняў паступова змяншалася. Яны саступалі месца павелічэнню аб’ёму досведна-ведавых каштоўнасцей. Уменняў і навыкаў з розных сфер грамадскай жыццядзейнасці. Такіх як паляванне, рыбалоўства, ці іншыя неабходныя практычныя віды дзейнасці абумоўленыя кліматычнымі і геаграфічнымі абставінамі таго ці іншага рэгіёна пражывання. А таксама веданне ўнутрыплемяннной абраднасці і міфалогіі. Уменне абыходзіцца з супрацьлеглым полам у межах мясцовых правіл і традыцый, ды інш. І паспяхова выконваць функцыі гаспадара сям’і (пасля станаўлення парных шлюбных адносін), альбо гаспадыні што валодала разнастайнымі навыкамі рукадзелля (для дзяўчынак). Усё гэта павінен быў засвоіць кандыдат у дарослую супольнасць. І тым самым прадэманстраваць сваю каштоўнасць для супляменнікаў і здольнасць выконваць функцыі дарослага чалавека.

Той з дзяцей, хто паспяхова праходзіў складаныя ініцыяцыйныя выпрабаванні атрымліваў права лічыцца дарослым чалавекам. Галоўным паказчыкам чаго быў дазвол на ўдзел у паўсядзённых справах родавага калектыву і права ўступаць у шлюб з мэтай нараджэння дзяцей, як прадаўжальнікаў чалавечай папуляцыі.

Калі падлетак не змог прайсці ініцыяцыйныя выпрабаванні (па любой з прычын: з нагоды фізіялагічнага, разумовага, псіхалагічнага ці іншага стану) ён не атрымліваў права лічыцца дарослым чалавекам. Да яго ставіліся як да вялікаўзроставага дзіцяці, пераростка, “івана-дурачка”. Ён не меў права ўступаць у шлюбныя адносіны, удзельнічаць у нараджэнні дзяцей. Не меў права голасу сярод прадстаўнікоў дарослай грамадзянскай супольнасці. Быў асуджаны на здзеклівыя адносіны супляменнікаў, кпіны і насмешкі як дарослых так і дзяцей. Нездарма такое стаўленне шырока зафіксавана ў фальклорных вобразах старажытнай культуры беларускага [19, с.77–85.], рускага [20, с.320–327] і ўкраінскага народаў.

Праз шматлікія стагоддзі і тысячагоддзі працэс накаплення і ўдасканалення грамадска-значнага досведу, а таксама перадача яго важнейшага зместу новым пакаленням, паступова прывялі сусветную грамадскасць да сучаснага стану і адпаведнага ўзроўню жыцця. Да стварэння і валодання складанымі машынамі і механізмамі, кампутарамі, самалётнай і касмічнай тэхнікай, нанатэхналогіямі, ды інш.

Сярод самых значных (вялікіх) досведных дасягненняў чалавецтва якія дыяметральна змянілі аблічча Сувету, даследчыкі называюць вынаходніцтва кола, пісьменнасці, кнігадрукавання, тэлеграфу, тэлефона, фатаграфіі, кіно, радыё, тэлебачання, персанальнага кампутара, мабільнага тэлефона, ровара, рухавіка ўнутранага згарання, інтэрнэту [21]. Іншыя, сярод дзесяці важнейшых дасягненняў, называюць (ужываючы даціроўку): кола (4000-3500 гг. да н. э.); цвікі (3400 г. да н. э.); мыла (2800 г. да н. э.); каналізацыю (2600 г. да н. э.); компас (206 г. да н. э.); паперу (105 г. да н. э.); друкавальны станок (1440 г.); лямпачку (1879 г.); антыбіётыкі (1928 г.); інтэрнэт (1969 г.) [22].

Вядома, што накапленне досведу яго ўдасканаленне і гістарычная трансляцыя не перапыняюцца і зараз. У наш час (сярэдзіна 20-х гг. XXI ст.) дасягненні чалавецтва

аказаліся настолькі высокімі што яно ўжо ажыццявіла вынаходніцтва штучнага інтэлекту. Цяпер гэта, без перабольшвання, навіна №1 у свеце. Пра яе вядзецца размова на самых высокіх узроўнях ў дзяржавах. Урады, прэзідэнты, міністры, розныя адказныя асобы і супольнасці спяшаюцца “спрагназаваць” магчымыя вынікі (уплывы) яго дзейнасці на розныя сферы жыцця грамадства. Але пакуль яшчэ гэта ўдаецца малавынікова. Хуткасць пашырэння сферы яго ўплыву настолькі высокая і непрадказальная што выклікае справядлівае (не жартоўнае) адчуванне страху за будучыню.

Цяпер ён ужо “умее ажыўляць” старыя фотаздымкі, стварае фантастычныя (фэйкавыя) відэа, ажыццяўляе “падробку” галасавых выказванняў палітыкаў і знакамітасцяў, піша музыку, вершы, песні і высокапрафесійныя кампутарныя праграмы, удзельнічае ў шматлікіх вытворчых і навуковых працэсах (напрыклад у медыцыне, мікраэлектроніцы, робататэхніцы) і ўсур’ёз пагражае стварыць рэальную канкурэнцыю жывому чалавеку. Тым самым выспявае сюжэт дастойны фантастычнага рамана пра ваеннае змаганне з інтэлектуальнымі робатамі. Перспектыва “выцесніць” чалавека з многіх відаў дзейнасці, ліквідаваць мноства прывычных грамадскіх прафесій, становіцца ў наш час непазбежнай рэальнасцю.

Абагульненні позірк на вышэй сказанае, такім чынам, сведчыць аб тым, што “*...культура, (гэта – В.П.) не клад і не склад каштоўнасцяў, а скарэй..., акумуляваная і канцэнтраваная энергія, назапашаная ўсім шматвяковым развіццём чалавечай цывілізацыі, намаганнямі ўсіх пакаленняў нашых продкаў...*” [23, с.14]. Прыведзены матэрыял відавочна і пераканаўча сведчыць аб тым, што вынікам сучасных неімаверна высокіх дасягненняў чалавецтва, асабліва ў параўнанні з першабытнасцю, безумоўна з’яўляецца грамадска-значны гістарычны міжпакаленны досвед.

Яго, дарэчы (у дачыненні да сучаснасці), можна называць і “навукова-практычным”. Найперш з-за вынаходніцтва навукай новых спосабаў арганізацыі жыццядзейнасці. Накаплення, паглыблення і спрыяння іх перадачы наступным пакаленням. Разам з тым, ужываючы словазлучэнне “навукова-практычны” неабходна ўсё-ж даць больш канкрэтнае тлумачэнне сувязі паміж паняццямі “досвед” і “навука”. Адказаць на пытанне: як суадносіцца гістарычная доследная эвалюцыя, з паняццем “навука”?

На наш погляд тэрмін “навукова-практычны” безумоўна мае права на існаванне. Асабліва ўлічваючы непасрэдную сувязь міжпакаленнага досведу з навукай. Чым гэта можна праілюстраваць? Справа ў тым што навука, як форма чалавечай дзейнасці, развіваецца ў межах накопленага досведу жыццядзейнасці. Займаецца менавіта працэсам пазнання рэчаіснасці. А рэчаіснасць, як вядома, гэта найперш формы жыцця і дзейнасці грамадства. Іншымі словамі, навука гэта “*...форма чалавечай дзейнасці якая склалася гістарычна, накіраваная на пазнанне і пераўтварэнне аб'ектыўнай рэчаіснасці. Такая духоўная вытворчасць, якая мае сваім вынікам мэтанакіравана адабраныя і сістэматызаваныя факты, лагічна выверанія гіпотэзы, абагульняючыя тэорыі, фундаментальныя і прыватныя законы, а таксама метады даследавання. Навука – гэта адначасова і сістэма ведаў і іх духоўная вытворчасць, і практычная дзейнасць на іх аснове...*” [24].

Інакш сучасная навука цалкам, грунтуецца на “доследных накапленнях” сабраных мінулымі пакаленнямі. Грамадска-значны досвед мінулых стагоддзяў і тысячагоддзяў гэта фундамент сучасных навуковых дасягненняў. І без яго гаварыць пра навуку канешне немагчыма. Але ўсё ж навука гэта асобная сацыяльная з’ява. Яна мае сваю ўласную гісторыю станаўлення. Спецыялісты (гісторыкі навукі і філосафы) у якасці пачатковай фазы яе станаўлення вылучаюць спачатку этап “пераднавукі” і толькі потым пачынаюць размову пра зараджэнне ўласна навукі. Як спецыфічнай галіны чалавечай жыццядзейнасці.

Увогуле, увесь перыяд гістарычнай эвалюцыі соцыуму (цывілізацыйнай дынамікі) вучоныя дзеляць на два перыяды: “традыцыйных цывілізацый” і “цывілізацый інавацыйнага альбо тэхнагеннага тыпу” і задаюцца пытаннем: “*ці існавала ў структуры традыцыйных цывілізацый*

*Старажытнага свету навука як спецыфічная форма пазнання?*". Асабліва ўлічваючы тое, што "*…у старажытнаўсходніх цывілізацыях – Егіпце, Вавілоне, Індыі, Кітаі – быў назапашаны велізарны масіў ведаў у галіне матэматыкі, медыцыны, астраноміі, геаграфіі, анатоміі. Дзякуючы гэтым ведам досыць паспяхова вырашаліся шматлікія праблемы, што ўзнікалі ў розных сферах жыццядзейнасці традыцыйных грамадскіх супольнасцяў…*". [25, с.71].

Хрэстаматыйны (агульнапрыняты ў наш час), адказ на сфармуляванае пытанне, які прыводзіцца нават у адпаведных падручніках для ВНУ, такі: "*…у структуры традыцыйных цывілізацый Усходу скла[-ўся] асаблівы тып пазнавальнай дзейнасці, які не з'яўляецца ўласна навуковым, а хутчэй адпавядае нормам і патрабаванням протанавуковага ведання. Гэтае веданне варта адносіць да праднавукі…*" [25, с.71].

У якасці прычыны такой высновы прыводзяцца доказы таго, што гэта быў прыклад "*…феномен[-а] так званай "рэцэптурнай навукі" альбо практычна арыентаванага ведання…*". Дзе "*адсутнічала фундаментальнасць і тэарэтычная арыентацыя ведаў якія выкарыстоўваліся*", а яе (тагачаснай "навукі") выкарыстанне ажыццяўлялася для "*тэхналагічнага забеспячэння непасрэдных практычных дзеянняў з аб'ектамі штодзённага досведу ў паўсядзённым жыцці*"; дзе "*трансляцыя ведаў (адбывалася – В.П.) праз традыцыю і з дапамогай механізмаў асобаснага або прафесійна-каставага атрымання ў спадчыну*"; дзе мелася "*неразвітасць альбо поўная адсутнасць крытыка-рэфлексіўнай дзейнасці ў адносінах да пазнавальнага працэсу і формаў генерацыі ведаў*"; дзе рабіўся "*акцэнт на вырашэнні прыкладных задач і распрацоўцы рэцэптурна-тэхналагічных схем практычнай дзейнасці, што прыводзіла да адсутнасці сістэматычнасці, доказнасці і абгрунтаванасці атрымліваемых ведаў*" [25, с.72].

Пачатак з'яўлення ўласна навукі, што характарызуецца тэарэтычным узроўнем, даследчыкі звязваюць з перыядам антычнага поліса ў Грэцыі (сярэдзіны I тысячагоддзя да н.э.), а таксама цывілізацыі Старажытнага Рыма. Важнейшай характэрнай рысай гэтай навукі, у параўнанні з пераднавуковым перыядам дзе рабіўся акцэнт на "*распрацоўцы рэцэптурна-тэхналагічных схем практычнай дзейнасці*" называецца пазнавальная дзейнасць "*на аснове апераджальнага адлюстравання рэчаіснасці*".

Інакш навука, у сучасным разуменні тэрміна, грунтуецца на міжпакаленным (накопленым грамадскай супольнасцю) досведзе, але апераджае яго. З'яўляецца (фактычна) формай дзейнасці, якая развівае (і прагназуе) будучы досвед у розных накірунках грамадскага жыцця.

Тэрміналагічнае апісанне такой навукі наступнае: "*Навука – гэта форма сацыяльна арганізаванай пазнавальнай дзейнасці, у якой на аснове апераджальнага адлюстравання рэчаіснасці ажыццяўляецца рацыянальна-паняційнае яе (рэчаіснасці – В.П.) засваенне, што фіксуецца ў сістэме прадметнага, аб'ектыўна-праўдзівага, новага ведання*" [25, с.72].

Да найбольш агульных асаблівасцяў, такога навуковага ведання, адносяць: "*…аб'ектыўны спосаб даследавання навакольнага свету; - арыентацыю навукі на прадбачанне магчымых у будучыні змен вывучаемых працэсаў; - сістэмны характар навуковага ведання*".

Падкрэсліваецца, што "*…навука ўтварае свае паняцці, гіпотэзы, тэорыі якія аб'ядноўваюцца ў каштоўнасную сістэму на падставе пэўных (вызначаных) прынцыпаў; - навука вядзе пошук аб'ектыўнай ісціны, як асобнай самакаштоўнасці, уласцівай бесперапыннаму працэсу атрымання новых ведаў; - навука выпрацоўвае сваю ўласную тэарэтычную мову, якая адлюстроўвае істотныя ўласцівасці вывучаемых з'яў (матэматычныя сімвалы, ураўненні, мадэлі і інш.); - навука пастаянна самаразвіваецца і крытычна ставіцца да сваіх вынікаў, удасканальваючы метады пазнання…*" [25, с.73].

Інакш навука гэта надзвычай высокі ўзровень (спосаб, сфера) пазнання, адлюстравання, даследавання і прагназавання рэчаіснасці. Яна безумоўна грунтуецца на грамадскіх досведных накапленнях

стагоддзяў і тысячагоддзяў. Але знаходзіцца ў авангардзе ўсіх сацыякультурных дасягненняў чалавецтва. Даследуе, прагназуе і ажыццяўляе іх сучасную прагрэсіўную эвалюцыю. Стварае новыя досведныя каштоўнасці (ажыццяўляе вынаходніцтвы) замацоўвае іх у грамадскай свядомасці, рухае наперад навуковае светасузіранне грамадства і прагназуе яго будучую траекторыю.

**Завяршаючы гаворку** пра міжпакаленны грамадска-значны досвед і яго гістарычную трансляцыю можна адзначыць што :

– цэнтральным асноватворным (істотным) працэсам у гістарычнай эвалюцыі любога грамадства з'яўляецца міжпакаленны грамадска-значны досвед. Ён не з'яўляецца статычным а знаходзіцца ў пастаянным дыялектычным (прагрэсіўна-рухомым) стане. Вынаходніцтва, замацавання ў грамадскай свядомасці і перадачы новым пакаленням найбольш аптымальных спосабаў арганізацыі жыццядзейнасці. Якія дапаўняюць і ўдасканальваюць яго, а потым перадаюць сваім нашчадкам;

– менавіта ўдалая праца з грамадска-значным досведам дазволіла чалавецтву захавацца ў гісторыі ў якасці асобнага віду. Захаваць сваю ролю "паспяховага гульца" (рус.: "игрока"), сярод глабальных сіл Прыроды альбо Сусвету. Дазволіла выжыць, забяспечыць сваё існаванне і дабіцца яго прагрэсіўнай эвалюцыі;

– паралельна з накапленнем грамадска-значнага досведу ішло ўдасканаленне спосабаў яго перадачы дзецям. Спачатку іх (асабліва хлопчыкаў) з дапамогай жорсткіх катаванняў прывучалі да паняцця забароны (табу) на бескантрольныя полавыя кантакты. Потым, пачалі зараджацца выпрабаванні падлеткаў у выглядзе ініцыяцыі. Якія пазней дапоўнілі перадініцыяцыйным паведамленнм ведаў. Так, задоўга да з'яўлення паняцця "школа" зарадзілася практыка навучання падлеткаў;

– сучасны погляд на гісторыю эвалюцыі міжпакаленнага досведу дазваляе вычленіць шэраг найбольш значных (вялікіх) дасягненняў чалавецтва, якія карэным чынам змянілі прывычныя формы жыццядзейнасці. Сярод іх вынаходніцтва кола, пісьменнасці, паперы, мыла, кнігадрукавання, паравога рухавіка, радыё, тэлефона, тэлебачання, кампутара, інтэрнэту, ды інш.;

– працэс эвалюцыі грамадска-значнага міжпакаленнага досведу мае самую прамую сувязь з навукай. Таму што навука, як форма чалавечай дзейнасці, развіваецца на падставе накопленага чалавецтвам досведу. Займаецца працэсам пазнання рэчаіснасці. А рэчаіснасць, як вядома, гэта найперш формы жыцця і дзейнасці грамадства;

– разам з тым навука мае сваю гісторыю эвалюцыі. Спачатку, па-меркаванні даследчыкаў, у цывілізацыях Старажытнага Усходу з'явілася праднавука, якая накапіла велізарную колькасць ведаў, але выконвала практычную абслугоўваючую ролю (засяроджвалася на "распрацоўцы рэцэптурна-тэхналагічных схем практычнай дзейнасці"). А з'яўленне ўласна навукі якая адштурхоўваецца ад фундаментальнасці і арганізавана ў якасці "апераджальнага адлюстравання рэчаіснасці" вучоныя адносяць да перыяду існавання антычнага поліса ў Грэцыі (сяр. I тыс. да н.э.), а таксама цывілізацыі Старажытнага Рыма;

– сённяшняя навука гэта надзвычай высокі ўзровень (спосаб, сфера) пазнання, адлюстравання, даследавання і прагназавання рэчаіснасці. Яна безумоўна грунтуецца на грамадскіх досведных накапленнях мінулага. Але знаходзіцца ў авангардзе ўсіх сацыякультурных дасягненняў чалавецтва. Стварае новыя досведныя каштоўнасці, ажыццяўляе вынаходніцтвы, замацоўвае іх у грамадстве. Рухае наперад навуковае светасузіранне і прагназуе яго будучую траекторыю.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Ковалева, А. И. Социализация / А. И. Ковалева // Энциклопедия гуманитарных наук. – 2004. – №1. – С. 139–143. – URL: https://cyberleninka.ru/article/n/sotsializatsiya. (дата обращения: 25.03.2025).
2. Лекторский, В. А. Опыт / В.А. Лекторский // Новая философская энциклопедия: в 4 т. / Институт философии РАН; /Предс. науч.-ред. совета В. С. Степин. 2-е изд., испр. и допол. – М. : Мысль, 2010. Интернет-версия издания. – URL: https://goo.su/eeXJK. (дата обращения: 23.07.2025).

3. Daniélou, J. La catéchèse aux premiers siècle / Jean Daniélou / Rédigé par Régine du Charlat / Collection Ecole de la foi. Paris: Fayard - Mame, 1968. – 267 p.
4. Тендрякова, М. В. Первобытные возрастные инициации в круге “вечных” вопросов / М. В. Тендрякова // Этнографическое обозрение. – 2014. – № 1. – С. 91-101. – EDN RXTCCL.
5. Жураковский, Г. Е. Очерки по истории античной педагогики / Г. Е. Жураковский / Под ред. И. Ф. Свадковского. – [2-е изд.]. – М. : АПН РСФСР, 1963. – 509 с.
6. Школа и педагогическая мысль средних веков // Возрождения и начала нового времени : сб. науч. тр. / Под ред. К. И. Салимовой, В. Г. Безрогова. – М. : АПН СССР, 1991. – 285 с.
7. Штец, А. А. Обучение грамоте в Древней Руси (X–XV века) / А.А. Штец // URL: https://goo.su/M082U5. (дата обращения: 26.04.2025).
8. Viriville, V. L’instruction publique en Europe et principalement en Franse depuis le creistianisme jusqu’a nos jours. Universités, colléges ecoles des deux sexes, académies, bibliothèques publiques, etc. / Vallet de Viriville. / Illustration archeologiques executeas sous la direction de Ferdinand Seré, directore artistique du grande ouvrage «Moyen age et la Renaissance». Paris: Administration du Moyen age et la Renaissance, 1848. – 400 p.
9. Гранстрем, Е. Э. Наука и образование / Е. Э. Гранстрем // История Византии. – М. : Наука, 1967. – 131 с.
10. Библия. Кн.1 : Бытие 1:1-19 – URL: https://www.bible.com/ru/bible/400/GEN.1.16” (дата обращения: 14.08.2025).
11. Калечиц, Е. Г. Юровичская верхнепалеолитическая стоянка: реальность и мифы / Е. Г. Калечиц. – Мн.: Беларуская навука, 2023. – 215 с.
12. Будзько, У. Дз., Ткачоў М. А. Бердыж / У. Дз. Будзько, М. А. Ткачоў // Археалогія Беларусі : энцыклапедыя. У 2 т. Т.1 / рэдкал. : Т. У Бялова (гал. рэд) [і інш.]. Мн. : БелЭн, 2009. – 496 с.
13. Анисимов, А. Ф. Духовная жизнь первобытного общества / А. Ф. Анисимов. – М.-Л.: Наука, 1966. – 244 с.
14. Инициация // 2024. – URL: https://bigenc.ru/c/initsiatsiia-1ac575. (дата обращения: 09.05.2023).
15. Ковалёва, А.И. Социализация– 2024. –: URL: https://cyberleninka.ru/article/n/sotsializatsiya/viewer. (дата обращения: 01.03.2025).
16. Элькин, А. Коренное население Австралии / А. Элькин ; пер. с англ. Л.Я. Бровика и В.П. Михайлова. Предисл. и ред. проф. С. А. Токарева. – М.: Иностранная литература, 1952. – 247 с.
17. Леви-Брюль, Л. Первобытное мышление / Пер. с фр. Б. И. Шаревской. – М.: Академический проект, 2020. – 430 с.
18. Символика смерти в обряде посвящения // Мирча Элиаде Тайные общества. Обряды инициации и посвящения / Пер. с фр. Г. А. Гельфанд; Науч. ред. А. Б. Никитин. – М. – СПб.: «Университетская книга», 1999. – 356 с.
19. Іван-дурак // Чарадзейныя казкі. У 2 ч. Ч.1. / [Скл. К. П. Кабашнікаў, Г. А. Барташэвіч; рэд. В. К. Бандарчык]. – Мн.: Навука і тэхніка, 1973. – 648 с.
20. Емеля-дурак // Народные русские сказки А.Н. Афанасьева: В 3 т. – М.: Наука, 1984–1985. – (Лит. памятники). Т. 1. – 1984. – 512 с.
21. Главные достижения человечества. – URL: https://clck.ru/3Ng68w. (дата обращения: 01.04.2025).
22. 10 великих изобретений. – URL: https://ethnomir.ru/articles/10-velikikh-izobreteniy/. (дата обращения: 22.01.2024).
23. Волков, Г.Н. У колыбели науки. – М.: Молодая гвардия, 1971. – 224 с.
24. Понятие науки ее структура и функции. – URL: https://goo.su/MUwxT. (дата обращения: 12.08.2025).
25. Андреева, Л. С. История и философия науки : учеб. пособие / Л. С. Андреева, П. А. Белоусов / Владим. гос. ун-т им. А. Г. и Н. Г. Столетовых. – Владимир : Изд. ВлГУ, 2021. – 192 с.

**References**

1. Kovaleva A. I. Socializaciya [Socialization] *Enciklopediya gumanitarnyh nauk* [Encyclopedia of the Humanities]. 2004, no.1, pp. 139–143. Available at:

https://cyberleninka.ru/article/n/sotsializatsiya. (accessed: 25.03.2025) (In Russian)

2. Lektorskij V. A. Opyt [Socialization]. *Novaya filosofskaya enciklopediya* [New Philosophical Encyclopedia: in 4 volumes / Institute of Philosophy, Russian Academy of Sciences] Moscow, Mysl, 2010. Internet-versiya izdaniya. (In Russian). Available at: https://goo.su/eeXJK. (accessed: 23.07.2025)
3. Daniélou J. La catéchèse aux premiers siècle Rédigé par Régine du Charlat. Collection Ecole de la foi. Paris: Fayard Mame, 1968, 267 p.
4. Tendryakova, M. V. Pervobytnye vozrastnye iniciacii v kruge "vechnyh" voprosov [Primitive age initiations in the circle of "eternal" questions]. *Etnograficheskoe obozrenie* [Ethnographic Review]. 2014, no.1, pp. 91-101. EDN RXTCCL (In Russian)
5. Zhurakovskij G. E. *Ocherki po istorii antichnoj pedagogiki* [Essays on the history of ancient pedagogy]. Ed. I.F. Svadkovskogo. Moscow, APN RSFSR, 1963, 509 p. (In Russian)
6. Shkola i pedagogicheskaya mysl srednih vekov. [School and pedagogical thought of the Middle Ages]. *Vozrozhdeniya i nachala novogo vremeni* [Renaissance and the beginning of modern times]. Eds. K. I. Salimovoj, V. G. Bezrogova. Moscow, APN SSSR, 1991, 285 p. (In Russian)
7. Shtec A. A. *Obuchenie gramote v Drevnej Rusi (H–HV veka)* [Literacy education in Ancient Rus' (10th–15th centuries)]. (In Russian). Available at: https://goo.su/M082U5. (accessed: 26.04.2025).
8. Viriville V. L'instruction publique en Europe et principalement en Franse depuis le creistianisme jusqu'a nos jours. Universités, colléges ecoles des deux sexes, académies, bibliothèques publiques, etc. Vallet de Viriville. Illustration archeologiques executeas sous la direction de Ferdinand Seré, directore artistique du grande ouvrage «Moyen age et la Renaissance». Paris: Administration du Moyen age et la Renaissance, 1848, 400 p.
9. Granstrem E. E. Nauka i obrazovanie [Science and education]. *Istoriya Vizantii* [History of Byzantium]. Moscow, Nauka, 1967, 131 p. (In Russian)
10. *Bibliya Kn.1:Bytie 1:1-19* [Bible. Book 1: Genesis 1:1-19]. (In Russian). Available at: https://www.bible.com/ru/bible/400/GEN.1.16". (accessed: 14.08.2025)..
11. Kalechic E. G. *Yurovichskaya verhnepaleoliticheskaya stoyanka: realnost i mify* [Yurovichi Upper Paleolithic site: reality and myths]. Minsk, Belaruskaya navuka, 2023, 215 p. (In Russian).
12. Budzko U. Dz., Tkachoў M. A. Berdyzh [Berdyzh]. *Arhealogiya Belarusi : encyklapedyya.* T.1 [Archaeology of Belarus: encyclopedia. In 2 volumes] Eds. T.U Byalova. Minsk, BelEn, 2009, 496 p. (in Belarusian)
13. Anisimov A. F. *Duhovnaya zhizn pervobytnogo obshestva* [Spiritual life of primitive society]. M.-L.: Nauka, 1966, 244 p. (In Russian)
14. *Iniciaciya* [Initiation]2024. (In Russian). Available at: https://bigenc.ru/c/initsiatsiia-1ac575. (accessed: 09.05.2023).
15. Kovalyova A.I. *Socializaciya* [Socialization] 2024. (In Russian). Available at: https://cyberleninka.ru/article/n/sotsializatsiya/viewer. (accessed: 01.03.2025).
16. Elkin A. *Korennoe naselenie Avstralii* [Indigenous people of Australia]. Moscow, Inostrannaya literatura, 1952, 247 p. (In Russian)
17. Levi-Bryul L. *Pervobytnoe myshlenie* [Primitive thinking]. Moscow. Akademicheskij proekt, 2020, 430 p. (In Russian)
18. Simvolika smerti v obryade posvyasheniya [The symbolism of death in the rite of passage]. *Mircha Eliade Tajnye obshestva. Obryady iniciacii i posvyasheniya* [Secret Societies. Initiation and Dedication Rites] / Ed. A. B. Nikitin. Moscow, SPb., «Universitetskaya kniga», 1999, 356 p. (In Russian).
19. Kabashnikaў K. P., Bartashevich G. A. Ivan-durak [Ivan the Fool] // *Charadzejnyya kazki.* Ch.1. [Magical Tales. Part 1.]. Ed. V. K. Bandarchyk. Minsk. Navuka i tehnika, 1973, 648 p. (in Belarusian)
20. Emelya-dura [Emelya the Foolk] *Narodnye russkie skazki A.N. Afanaseva.* [Russian folk tales by A.N. Afanasyeva]. Moscow. Nauka,

1984–1985. (Lit. pamyatniki). Vol. 1, 1984, 512 p. (In Russian)
21. *Glavnye dostizheniya chelovechestva* [The main achievements of mankind]. Available at: https: //clck.ru/3Ng68w. (accessed: 01.04.2025). (In Russian)
22. *10 velikih izobretenij* [10 Great Inventions]. Available at: https://ethnomir.ru/articles/10-velikikh-izobreteniy/. (accessed: 22.01.2024). (In Russian)
23. Volkov G.N. *U kolybeli nauki* [At the cradle of science]. Moscow. Molodaya gvardiya, 1971, 224 p. (In Russian)
24. *Ponyatie nauki ee struktura i funkcii* [The concept of science, its structure and functions]. (In Russian). Available at: https://goo.su/MUwxT. (accessed: 12.08.2025).
25. Andreeva L.S., Belousov P.A. *Istoriya i filosofiya nauki* [History and philosophy of science]. Vladimir. Izd. VlGU, 2021, 192 p. (In Russian)

*Received 10.03.2026*